View metadata, citation and similar papers at core.ac.uk brought to you by CORE

# ЗАКОН АД 10 Л1ПЕНЯ 1919 г. ЯК ПЕРШЫ ЭТАП ЗАКАНАДАУЧАГА АФАРМЛЕННЯ АГРАРНАЙ РЭФОРМЫ НА ЗЕМЛЯХ ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУС1

**В. П. Гарматны**

*Беларуск дзяржауны утвератэт*

Першая сусветная (1914-1918) і Савецка-польская (1919-1921) войны прывялі да разбурэння гаспадаркі Беларусі. Адной з асноуных задач польскага урада стала узняцце з руш сельскай гаспадаркі Заходняй Беларусі, якая была далучана да Польшчы, і забеспячэнне прадуктовай бяспекі крашы. У шруючых і палітычных колах адроджанай Польшчы шло актыунае абмеркаванне разнастайных праектау аграрнай палітыкі. У Сейме Другой Рэчы Паспал^ай дзейшчала камісія аграрных рэформ [5, с. 59-60]. У 1919 г. з мэтаю правядзення планавых аграрных пераутварэнняу польскімі уладамі была створана Галоуная зямельная управа (ГЗУ) [6, с. 131], пераутвораная у 1923 г. у Мшстэрства аграрных рэформ.

На неабходнасць спалучэння аграрнай рэформы і каланізацыі «крэсау усходніх» звяртала увагу сеймавых паслоу фракцыя Народна-нацыянальнага Саюза (ННС, ZLN, Zwiazek Ludowo-Narodowy, «эндэцыя»), дасылаючы маршалку Сейма Войцэху Тампчынскаму 9 красавіка 1919 г. прапанову, у якой прадшсвалася магчымасць задавальнення патрабаванняу мясцовага насельніцтва у залежнасці ад вызначэння лініі усходняй мяжы Польшчы. Пасол Ян Лютаслаускі (ННС) выказвауся за неабходнасць правядзення на усходшх землях Другой Рэчы Паспалгтай паланізацыі і адзначау неабходнасць яе эвалюцыйнага характару, бо у іншым выпадку яна можа узрушыць асновы існавання дзяржавы. Фракцыя Польскай нацыянальнай партып-«Пяст» (ПНП-«Пяст», PSL-«Piast», «людауцы») падкрэ^вала, што асноваю дзяржавы з'яуляецца сялянства, і лічыла правядзенне аграрнай рэформы дзяржаунай і нацыянальнай праблемай, «вырашэнне якой пашырыць межы дзяржавы і Узмоцніць польскае панаванне» [2, с. 97].

Яшчэ падчас Савецка-польскай вайны, 10 лшеня 1919 г., Сейм Уставадаучы па прапанове урада на чале з 1гнацы Янам Падэрэусшм пасля працяглай гарачай дыскусп большасцю усяго у адзш голас прыняу «Прынцыпы зямельнай рэформы і аддзяржаулення лясоу» - першы закон па аграрным пытанні у міжваеннай Польш-

чы [3, с. 3-4; 11, с. 128]. Паводле закона са свабодных ворных зямель, якія у вышку войнау засталіся без гаспадароу, уладамі стварауся дзяржауны зямельны фонд, праводзіліся выкуп і парцэляцыя (продаж зямлі невялікімі надзеламі - парцэлам^ часткі памешчыцкіх маёнткау звыш вызначанага максімуму валодання зямлёй: для Заходняй Беларум і Заходняй Украшы гэты памер складау 400 га, а для этшчнай Польшчы - 180 га [9, с. 215]. Уладальшш высокапрадукцыйных насенных, жывёлагадоучых, рыбных і іншых спецыялізаваных гаспадарак вызваляліся ад прымусовай парцэляцыі належачых ім зямель [4, с. 25; 8, с. 127]. Штогод прапанавалася парцэляваць па 200 000 га.

Дзеля правядзення парцэляцып вызначал^я маёнткі, якія бы^ уласнасцю дзяржавы; маёнткі, якія раней належалі членам дынастыі захопнщшх дзяржау, Рускаму сялянскаму банку; маёнтш, набытыя пры дапамозе ліхвярства і зямельнай спекуляцыі, а таксама маёнтш альбо іх часткі, выкупленыя дзяржаваю у прыватных уладальнікау у прымусовым парадку па меры развщця парцэляцып [1, с. 6-7]. У першую чаргу парцэляцып падлягалі маёнтш, яшя бы^ разбураны падчас Першай сусветнай і Савецка-польскай войнау і іх уладальнік не меу намеру аднауляць гаспадарку, маёнткі з неурэгуляваным пытаннем аб сервітутах і г. д. [8, с. 128], а таксама землі «мёртвай рукі» (царкоуныя, касцёльныя, манастырскія і г. д.) па узгадненні з Ватыканам. Маёнткі, якія знаходзіліся на шзшм узроУні сельскагаспадарчага развіцця і прыносілі страты (мала пастаулялі на рынак прадуктау), падлягалі парцэляцыі у поуным памеры. Лес з парцэляваных маёнткау поунасцю адыходзіу ва уласнасць дзяржавы.

Перш за усё падчас правядзення парцэляцып зямлю атрымоувалі батракі, што страцілі працу у выніку ажыццяулення аграрнай рэформы, затым былыя уласнікі дробных і карлшавых гаспадарак, салдаты польскай арміі пасля вяртання з войска, а таксама беззямельныя і малазямельныя сяляне, яшя шчым іншым не займал^я і для якіх зямля служыла асноунай крыніцай існавання.

Закон прадугледжвау стварэнне новых хутароу і прырэзку зямлі карлікавым гаспадаркам, прычым агульная плошча надзелу не павшна была перавышаць 25 моргау (14 гектарау) [12, с. 22]. Кошт зямлі не вызначауся, аднак мясцовым уладам пры вызначэнні кошту зямлі прадпісвалася прымаць пад увагу не тольш яе «вытворчую вартасць», але і вартасць пасевау, меліярацыйныя работы і г. д. Уласнікі самастойных гаспадарак пры магчымасці Уносілі плату наяунымі грашыма, а малазямельныя маги атрымаць ільготную дзяржауную пазыку.

«Сейм спрабавау заваяваць сялянства аграрнай рэформай», - пісау вядомы дзяржауны і палітычны дзеяч Другой Рэчы Паспалгтай Вацлау Студніцкі [5, с. 59]. Памешчыш выступалі супраць пазбаулення нават частш сва1х зямель, так, напрыклад, на з'ездзе Кам^п польсшх саюзау землеуладальнікау Казімір Святаполк-Мірскі адзначыу, што « памешчыкі заусёды выступай супраць такога закона аб аграрнай рэформе, але гэта зумм не значыць, што яны выступалі супраць удасканалення аграрнай структуры дзяржавы» [7, с. 39].

Правыя партыі (хрысщянсшя дэмакраты - «хадэкі» і шшыя) выступілі з асуджэннем такога плана аграрнай рэформы і распачалі шырокую агітацыю супраць яго. ГалоУнымі аргументамі правых сталі наступныя сцвярджэнш:

1) прымусовая парцэляцыя парушае права прыватнай уласнасці і супярэчыць хрысціянскім законам;

2) у руках польсшх памешчыкау няма такой колькасщ зямлі, якой хапіла б на надзяленне ёю малазямельных і беззямельных сялян;

3) аграрная рэформа, праведзеная на ташх умовах, магла б лшвщаваць паспяховыя асабістыя гаспадаркі, яшя пастаулялі сваю прадукцыю на экспарт;

4) правядзенне аграрнай рэформы і перш за усё парцэляцып на «крэсах усходшх» магло б аслабщь эканамічную перавагу польскіх землеуласшкау.

Правыя сцвярджалі, што такая аграрная рэформа магла б аслабщь сельскую гаспадарку і у выніку падарваць эканомшу кра1ны.

«Людауцы» з ПНП-«Пяст» і ПНП-«Вызваленне» прыводзілі наступныя контраргументы:

1) незалежная дзяржава не можа дазволщь сабе, каб тыя яе грамадзяне, што «жыватом і крывёю» баранілі яе, дыскрымшаваліся эканамічна і культурна;

2) эканамісты сцвярджал^ што сяляне з 1 га зямлі могуць даць прадуктау больш, чым у экстэнмунай памешчыцкай гаспадарцы;

3) павышэнне заможнасці сялян станоуча пауплывае на іх пакупніцкую здольнасць, што дазволщь паспяхова развівацца прамысловасці;

4) на працягу 1919-1920 гг. «людауцы» адзначалі небяспечныя пракамуністычныя настроі значнай часткі сялян, яшя пакуталі ад зямельнага голаду [10, с. 266].

Прыняцце Закона аб аграрнай рэформе ад 10 лшеня 1919 г. выклшала незадавальненне пераважна памешчыкау і кансерватарау. Памешчыцкі друк пісау, што гэта не быу «закон аб аграрнай рэформе, а закон аб забіранні зямлЬ» і што «нягледзячы на сваю

назву рэформа не з'яуляецца аграрнаю рэформаю, бо не прыносщь змен у аграрныя адносшы». На думку памешчыкау, аграрная рэформа павшна насщь эвалюцыйны характар і найлепшай формай зямельных пераутварэнняу была бы добраахвотная перадача памешчыкамі часткі сваіх зямель ураду з кампенсацыяй яе кошту [8, с. 129].

Ташм чынам, Закон аб аграрнай рэформе ад 10 лшеня 1919 г. наму дэкларатыуны характар, і таму не быу апублшаваны у дзяржауным друкаваным органе «Dziennik ustaw Rzeczypospolitej Polskiej», і таму не меу абавязковай сшы. Але асноуныя яго палажэнш атрымалі працяг у наступных законах польсшх улад па аграрным пытанш і таму разглядаемы закон стау першым этапам заканадаучага афармлення аграрнай рэформы.

### Л1таратура


1. *Гак, Л.* Аграрная полиыка польскай буржуазіі у Заходняй Беларусі / Л. Гак. - Мшск, 1933. - 95 с.

2. *Гамулка, К.* Памшж Польшчай і Расяй. Беларусь у канцэпцыях польскіх палітычных фарміраванняу (1918-1922 гг.) / К. Гамулка. - Вшьня, 2008. - 256 с.

3. *Грэсь, С. М.* Законы аб аграрнай рэформе 1919-1925 гг., іх распрацоука і прыняцце у Сейме і Сенаце / С. М. Грэсь // Весн. Гродз. дзярж. ун-та. Сер. 1. - 2007. - № 4. - С. 3-7.

4. *Зялтст, П. І.* Аграрная рэформа у Заходняй Беларус (1919-1939 гг.) / П. І. Зялшсм // Праблемы уз'яднання Заходняй Беларус з БССР: псторыя і сучаснасць: матэрыялы Міжнар. навук.-тэарэт. канф., Мшск, 17-18 верас. 1999 г. / Беларус. дзярж. ун-т. - Мшск, 2000. - 332 с.

5. *Сорокин, А. А.* Аграрный вопрос в Западной Белоруссии (1920-1939 гг.) / А. А. Сорокин. - Минск, 1968. - 204 с.

6. *Brzoza, Cz.* Polska w czasach niepodleglosci i Drugiej Wojny Swiatowej (1918-1945) / Cz. Brzoza. - Krakow, 2001. - 424 s.

7. *Galka, B. W.* Miejsce i rola ziemianstwa w strukturze spoleczno-economicznej II Rzeczypospolitej. Zarys problematyki / B. W. Galka // Dzieje Najnowsze - 1985. - № 1. - S. 33-52.

8. *Galka, B. W.* Ziemianie i ich organizacje w Polsce lat 1918-1939 / B. W. Galka. - Torun, 1999. - 214 s.

9. Historia chlopow polskich / pod redakcja Stefana Inglota. - Wroclaw, 1995. - 395 s.

10. *Jezierska, A.* Historia gospodarcza Polski / A. Jezierska, C. Leszczynska. - Warszawa, 1999. - 560 s.

11. *Madajczyk, C.* Burzuazyjno-obszarnicza reforma rolna w Polsce (1918-1939) / C. Madajczyk. - Warszawa, 1956. - 465 s.